# ДАСЯГНУЛІ ЛІЧБЫ 50!

## У Мінску адкрылі юбілейны павільён «Белсаюздруку»

**50-ы па ліку аб'ект новага фармату адкрылі ў Мінску на бульвары Трактарабудаўнікоў каля прыпынку грамадскага транспарту. Раніцай у чаканні трамваяў і аўтобусаў тут збіраюцца дзясяткі людзей. Цяпер бавіць час будзе нашмат прыемней: можна зайсці ва ўтульны павільён па свежую прэсу і нават выпіць кубачак духмянай кавы.**



Як расказала на адкрыцці гандлёвага аб'екта **начальнік аддзела гандлю і паслуг Партызанскага раёна Ніна НЯДЗЕЛЬЧЫК**, аб'екты такога фармату значна паляпшаюць абслугоўванне спажыўцоў. А менавіта зараз, падчас асенне-зімовага перыяду, у такім камфортным месцы правесці свой вольны час пакупнікам будзе больш прыемна.

— Плошча новага аб'екта — 27 кв. м. Такі памер памяшкання дазваляе размяшчаць тут вялікі асартымент прадукцыі. Акрамя перыядычных выданняў тут прадаюць кнігі,



Таццяна ТРАФІМЕНКА, адна з першых пакупнікоў.

канцылярскія тавары, цацкі, сувеніры, навагодняя ўпрыгажэнні і шмат іншага. Кожны новы аб'ект стараемся ўсё больш удасканаліць. Да канца года плануем адкрыць яшчэ тры павільёны ў Мінску. Гэта таксама будзе замена звычайных кіёскаў на гандлёвыя аб'екты новага тыпу, — дадала **інструктар па павільёнах Людміла ДРАЗДОВА.**

**Ганна ЗАНКОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

■ Не прапусці!

# НА МЯЖЫ МАСТАЦТВА І НАВУКІ

**З 24 лістапада па 6 снежня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» будзе праходзіць унікальная выстаўка работ Эвеліны Домніч і Дзмітрыя Гельфанда «Рабізна нябачных палёў», прымеркаваная да Года навукі.**

Абапіраючыся на веды ў хіміі, фізіцы і філасофіі, Эвеліна і Дзмітрый ствараюць новыя выразныя сродкі мастацтва, унікальныя творы XXI стагоддзя, якія прымушаюць па-дзіцячы здзіўляцца і задавацца пытаннямі пра магчымасці і межы сучаснага мастацтва. Замест фарбаў яны выкарыстоўваюць выпраменьванні і іншыя фізіка-хімічныя ўласцівасці матэрыі, ствараючы асаблівае асяроддзе для сэнсарнага ўспрымання сваіх фантастычных работ. Іх работы ўяўляюць сабой сімбіёз мастацтва, фізікі, хіміі, інфарматыкі, філасофіі і феназменалогіі.

Да мастацкай практыкі Эвеліна Домніч і Дзмітрый Гельфанд прыйшлі рознымі шляхамі. Эвеліна нарадзілася ў Мінску і мае дыплом філасофскага факультэта БДУ. Дзмітрый родам з Санкт-Пецярбурга, у 1996 годзе ён атрымаў ступень бакалаўра выяўленчых мастацтваў (кіно і відэа) Нью-Ёркскага ўніверсітэта. У 1997 годзе яны сустрэліся ў ЗША. З тых часоў абое захоплены спасціжэннем навакольнага свету і космасу, спрабуюць знайсці чары з сучаснай навукі пры дапамозе незвычайных мастацкіх эксперыментаў і спецыяльна створаных для гэтага прыбораў. Выкарыстоўваючы свой досвед у галіне візуальных мастацтваў, яны ствараюць разнастайныя мастацкія інсталяцыі і перфомансы.

Іх работы былі адзначаны ганаровымі прэміямі Japan Media Arts (Японія, 2007 год), ганаровымі прэміямі Ars Electronica (Аўстрыя, у 2007, 2009, 2011, 2013 і 2017 гадах). Мастакі супрацоўнічаюць з многімі навукова-даследчымі лабараторыямі ўніверсітэтаў, Інстытутам сучасных навук і тэхналогій (Японія), факультэтам фізікі і астраноміі Vrije Universiteit (Нідэрланды). У 2012 годзе яны адкрылі сваю ўласную лабараторыю «Synergetica» ў Амстэрдаме.

Праз інсталяцыі і перфомансы дуэт мастакоў дэманструе гледачам фізічныя феномены, якія ў звычайных умовах недаступныя простаму воку. Яны падштурхоўваюць усіх да больш глыбокага асэнсавання навакольнага свету.

Адкрыццё выстаўкі адбудзецца 23 лістапада ў 17.30. Уваход бясплатны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## Объявление о торгах

| Лоты № | Наименование имущества | Количество, мера, вес | Стоимость |
|---|---|---|---|
| 1 | Реактор DGM для приготовления питательных сред инактивных V1000 л | 1 | 6 032,00 белорусских рублей |
| 2 | Реактор DGM для смешивания монокультур лептоспироза V1000 л | 1 | 6 023,00 белорусских рублей |
| 3 | Реактор DGM для инактивации V1000 л | 1 | 6 023,00 белорусских рублей |
| 4 | Устройство для просмотра флаконов (мод. SBINS-100) | 1 | 1 699,00 белорусских рублей |
| 5 | Резервуар-смеситель для растворения ингредиентов 10 л | 1 | 54,00 белорусских рублей |
| 6 | Промежуточная напорная емкость 10 л | 1 | 28,00 белорусских рублей |
| 7 | Промежуточная напорная емкость 10 л | 1 | 28,00 белорусских рублей |
| 8 | Промежуточная напорная емкость 5 л | 1 | 17,00 белорусских рублей |
| 9 | Промежуточная напорная емкость 5 л | 1 | 17,00 белорусских рублей |
| 10 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 49,00 белорусских рублей |
| 11 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 49,00 белорусских рублей |
| 12 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 49,00 белорусских рублей |
| 13 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 49,00 белорусских рублей |
| 14 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 49,00 белорусских рублей |
| 15 | Напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 49,00 белорусских рублей |
| 16 | Промежуточная напорная емкость для сбора вирусов, 20 л | 1 | 49,00 белорусских рублей |
| 17 | Напорная емкость, вместимость 20 л | 1 | 48,00 белорусских рублей |
| 18 | Напорная емкость, вместимость 100 л | 1 | 215,00 белорусских рублей |
| 19 | Напорная емкость, вместимость 20 л | 1 | 48,00 белорусских рублей |
| 20 | Напорная емкость, вместимость 20 л | 1 | 48,00 белорусских рублей |
| 21 | Напорная емкость, вместимость 20 л | 1 | 48,00 белорусских рублей |
| 22 | Напорная емкость, вместимость 50 л | 1 | 111,00 белорусских рублей |
| 23 | Установка для мойки и стерилизации оборудования CIP/SIP | 1 | 6 713,00 белорусских рублей |
| 24 | Ферментер для выращивания культур клеток в асептических условиях BMR-K450U, 50 л | 1 | 360,00 белорусских рублей |
| 25 | Ферментер для выращивания культур клеток в асептических условиях BMR-K70U, 300 л | 1 | 2 199,00 белорусских рублей |
| 26 | Ферментер для выращивания культур клеток в асептических условиях BMR-K10U, 7 л | 1 | 43,00 белорусских рублей |
| 27 | Сборник DGM для фильтрации MSJ-100 | 1 | 262,00 белорусских рублей |
| 28 | Установка для мойки SIP | 1 | 14 954,00 белорусских рублей |
| 29 | Машина для маркировки ампул YZ 5/10 | 1 | 67 018,00 белорусских рублей |
| 30 | Атомно-абсорбционный спектрометр | 1 | 54,00 белорусских рублей |
| 31 | Лиофильная сушка Alpha I-4 | 1 | 11 662,00 белорусских рублей |
| 32 | Шкаф сушильный вакуумный электрический | 1 | 283,00 белорусских рублей |

| | |
|---|---|
| Собственник (владелец) имущества | Витебская область.<br>Право собственности: ОАО «Белвитунифарм» (Витебский район, д. Должа, ул. Советская, д. 26А), УНП 811001710 |
| Местонахождение имущества | г. Витебск<br>По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ОАО «Белвитунифарм» – Большакову Сергею Александровичу (т. р. 80212-20-94-10) |
| Наличие обременений | Не имеет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения Витебского района<br>г. Витебск, ул. Кирова, д. 7/13, каб. 6<br>22 декабря 2017 года в 10.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения Витебского района<br>г. Витебск, ул. Кирова, д. 7/13<br>Начальник отдела – Колядко Александр Михайлович, тел. (80212-64-71-29, т. м. 375 33 687-88-64, эл. почта opi208@minjust.by) |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет на депозитный счет отдела принудительного исполнения Витебского района №BY60 AKBB 3642 9030 0266 1200 0000 в филиале №200 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебска, код банка AKBBBY21200, УНП 300002505, с пометкой за лот №(1-32) ОАО «БелВитунифарм» не позднее 14.00 21 декабря 2017 года.<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% от стоимости лота.<br>В соответствии со ст. 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

■ Будзь у курсе!

# Праязны на гадзіну

**У грамадскім транспарце сталіцы ён можа з'явіцца ўжо ў наступным годзе, паведамілі ў ДУ «Сталічны транспарт і сувязь».**

У цяперашні час пасажыры, незалежна ад таго, колькі прыпынкаў трэба праехаць, плацяць адну цану. «Лічу, на «кароткае плячо» кошт павінен адрозніваца. Але гэта няпростае рашэнне, яно патрабуе тэхнічнай падрыхтоўкі. Хацелася б, каб праект «Мінсктранса» быў рэалізаваны ў максімальна кароткія тэрміны, можа, у наступным годзе, — выказаў сваё меркаванне кіраўнік прадпрыемства Валерый Шкуратаў.

Дарэчы, у многіх замежных краінах пасажыры ўжо даўно карыстаюцца такой магчымасцю. Напрыклад, у Празе можна набываць талончыкі на паўгадзіны, на паўтары гадзіны, на ўвесь дзень. На працягу гэтага часу можна скарыстацца любым транспартам, уключаючы метро. Час адліку будзе прабіты ў першым транспартным сродку, якім скарыстаецца пасажыр.

Валерый Шкуратаў таксама паведаміў, што ў 2018 годзе сталічны аўтапарк папоўніцца 300 аўтобусамі МАЗ 107-й, 203-й і 215-й мадэляў. А да пачатку II Еўрапейскіх гульняў, якія пройдуць у 2019 годзе, Мінску неабходна будзе закупіць яшчэ 150 аўтобусаў і 200 тралейбусаў або электробусаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ЦЕПЛЫНЯ ПРЫЙДЗЕ З АТЛАНТЫКІ

**У першай палове тыдня ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будуць вызначаць паветраныя масы, што паступаюць са Скандынавіі, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Тады тэмпературны фон будзе блізкі да кліматычнай нормы. Але ўжо ў другой палове тыдня да нас пачне паступаць больш цёплае паветра з Атлантыкі.**

У сераду будзе воблачнае з праясненнямі надвор'е, у асобных раёнах краіны не абыдзецца без невялікага снегу. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 1—6 градусаў марозу, удзень будзе знаходзіцца ў межах ад мінус 2 градусаў да плюс 3 градусаў.

Прагназуецца, што ў чацвер да нас завітае атмасферны фронт, які абумовіць пераважна па заходняй частцы краіны ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах Беларусі чакаецца туман, слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы знізіцца да мінус 1—7 градусаў, удзень складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. У заходніх раёнах будзе цяплей, начная тэмпература складзе каля нуля, а ўдзень — да плюс 4—7 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу ў асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, толькі па ўсходзе пры праясненнях панізіцца да мінус 7 градусаў. Удзень будзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, па захадзе — 6—8 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ На слыху

# ЗА ШПІЯНАЖ І ЗДРАДУ ДЗЯРЖАВЕ

**Пры правядзенні агентурнай акцыі 25 кастрычніка Камітэтам дзяржбяспекі затрыманы на месцы злачынства кадравы супрацоўнік галоўнага ўпраўлення разведкі Міністэрства абароны Украіны Павел Шаройка, паведаміў журналістам падчас брыфінгу афіцыйны прадстаўнік КДБ Беларусі Дзмітрый ПАБЯРЖЫН.**

Паводле яго слоў, з улікам вопыту работы Паўла Шаройкі ў якасці кіраўніка прэс-службы галоўнага ўпраўлення разведкі Міністэрства абароны Украіны для прыкрыцця ён быў прызначаны на пасаду карэспандэнта грамадскай нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Украіны. У Беларусі Шаройка стварыў агентурную сетку з ліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія за грашовыя ўзнагароды выконвалі яго заданне па зборы звестак разведвальнага характару ў ваенна-палітычнай сферы. У дачыненні да Паўла Шаройкі заведзена крымінальная справа па арт. 358 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь («Шпіянаж»). Прынятае рашэнне аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўтрымання пад вартай.

— Падчас праведзеных аператыўных дзеянняў атрыманы пераканаўчыя доказы яго проціпраўнай дзейнасці, якая наносіць шкоду нацыянальным інтарэсам Беларусі, — сказаў Дзмітрый Пабяржын. — Падчас вобыску ў затрыманага выяўлены копіі разведвальных данясенняў, скіраваных раней у цэнтр. У выніку сам Шаройка прызнаў, што з'яўляецца супрацоўнікам кадравага апарату ваеннай разведкі, які працуе пад прыкрыццём, а таксама саваё воінскае званне палкоўніка. Пацвердзіў, што каардынацыю яго разведвальнай дзейнасці ажыццяўляў супрацоўнік галоўнага ўпраўлення разведкі мінабароны Украіны Ігар Скварцоў, які дзейнічаў пад прыкрыццём на пасадзе саветніка пасольства Украіны ў Беларусі. За дзейнасць, несумяшчальную з дыпламатычным статусам, Скварцоў аб'яўлены персонай нон-грата.

25 кастрычніка ў Міністэрства замежных спраў Беларусі накіраваны матэрыялы, якія пацвярджаюць проціпраўную дзейнасць спецслужбаў Украіны супраць нашай дзяржавы. Праз некалькі гадзін аб затрыманні ўкраінскага разведчыка знешнепалітычным ведамствам быў праінфармаваны пасол Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Ігар Кізім.

Падчас збору сакрэтных матэрыялаў затрыманы і грамадзянін Беларусі, які ажыццяўляў шпіёнскую дзейнасць у інтарэсах Украіны. Беларус сваю віну прызнаў і паведаміў, што па заданні украінскай ваеннай разведкі за грашовую ўзнагароду займаўся зборам і перадачай інфармацыі аб абараназдольнасці Беларусі. У дачыненні да яго заведзена крымінальная справа па арт. 356 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь («Здрада дзяржаве»).

Камітэт дзяржбяспекі праводзіць комплекс неабходных мерапрыемстваў і следчых дзеянняў для ўнясення поўнай яснасці ў характар незаконнай дзейнасці затрыманых. Іншая інфармацыя ў інтарэсах следства не распаўсюджваецца.

**Вольга ЗАРЭЧНАЯ**

В извещении о проведении аукциона ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ», опубликованном в газете **«ЗВЯЗДА» от 27.10.2017 г. №208,** допущены неточности.
**Следует читать:**
**1. Земельный участок с кадастровым номером 500000000006008763, пл. 0,8393 га.**
**2. Доля в праве постоянного пользования на земельный участок, относящаяся к изолированному помещению.**
Дополнительная информация по тел.: +375 17 284 94 32; +375 25 684 22 55, +375 29 684 22 55. Email: yakovenko@horizont.bn.by
УНП 101059240